# ШЧАСЦЯ ВАМ, ДАРАГІЯ!

На нашым здымку іх толькі чацвёра з мільёнаў слаўных працаўніц вялікай Краіны Саветаў. Сустрэліся яны на нарадзе ў Гарадоцкім райкоме партыі і адразу ж пасябравалі, бо ў іх агульныя высакародныя інтарэсы, агульная мэта — будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Але ў кожнай з гэтых жанчын свой асабісты лёс, непадобны на лёс іншых. Незвычайна склаўся ён у Апаліны Ніканаўны **Ліцкевіч** (на здымку злева). Грудзі яе ўпрыгожваюць баявыя ўзнагароды, сярод якіх ордэн Чырвонай Зоркі. Так, Апаліна Ніканаўна ў мінулым — афіцэр Савецкай Арміі. Пяшчотная жанчына знайшла ў сабе сілы і мужнасць крочыць праз усю вайну побач з мужчынамі і закончыла яе на Балканах у якасці намесніка камандзіра сапёрнай роты. Зусім нечаканае прымяненне знайшлі на вайне спрытныя і тонкія жаночыя рукі: тысячы і тысячы ўзрывальнікаў варожых мін, поўных у сабе страшэнную смерць, абясшкодзіла старшы лейтэнант інжынерных войск Апаліна Ніканаўна Ліцкевіч. Яна ўмела настройвала ўзрывальнікі, якія знішчалі ворага.

Каб уявіць подзвіг гэтай жанчыны, дастаткова назваць адну лічбу: сапёры роты пад кіраўніцтвам А. Н. Ліцкевіч у Закарпацці за кароткі тэрмін абясшкодзілі каля 800 тысяч мін!

У жанчыны побач з баявымі ўзнагародамі маленькі ромбік — сведчанне аб атрыманай вышэйшай адукацыі, сведчанне самых мірных намераў былога воіна. Пасля вайны яна выбрала мірную прафесію бібліятэкара. Ёй яна і аддае ўсё сваё ўменне і сілы. Апаліна Ніканаўна працуе загадчыкам бібліятэкі тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі. Яна і пяшчотная маці, і ўважлівая жонка, і добрая гаспадыня.

Нямала цікавага можна расказаць пра Тамару Дзмітрыеўну **Ліс** (другая злева). І яна адзначана ордэнам. Але гэту ўзнагароду атрымала Тамара Дзмітрыеўна не зусім на іншай ніве — за чуласць і ўменне, праяўленыя ёю ў самай гуманнай прафесіі на свеце. Тамара Дзмітрыеўна Ліс — урач-педыятр. Яна працуе ў цэнтральнай бальніцы раённага цэнтра. За дваццаць гадоў сваёй высакароднай працы ўрач атрымала падзяку ад соцень сваіх маленькіх пацыентаў і іх родных.

Заслужаная настаўніца школы БССР Кацярына Пятроўна **Славецкая** — настаўніца першай Гарадоцкай сярэдняй школы. Высокае давер'е аказалі ёй землякі, назваўшы сваім кандыдатам у дэпутаты вышэйшага органа ўлады рэспублікі. У дзень выбараў яны з радасцю аддадуць галасы за свайго пасланца ў Вярхоўны Савет БССР.

Чацвёртая на нашым здымку — свінарка саўгаса імя Дзімітрава Зоя Іванаўна **Якаўлева**. І гэтая сумленная працаўніца ўдастоена ўрадавай узнагароды. Летась Зоя Іванаўна адкарміла 1300 свіней. Яшчэ больш высокага поспеху дабіваецца яна сёлета.

Гэтыя жанчыны, выдатныя працаўніцы заслужылі ўдзячнасць людскую, усмешкі і кветкі. Заслужылі самых шчырых пажаданняў шчасця і доўгіх год жыцця на радасць людзям.

Тэкст і фота **С. Капелькі.**

часопісаў — 18 мільёнаў экземпляраў.

* * *

Першай у свеце жанчынай, якая ўзляцела на зоркавую арбіту, была грамадзянка Савецкага Саюза Валянціна Уладзіміраўна Нікалаева-Церашкова.

